# Літаратурная старонка "Натхненне"

***Уладзіміра Папковіча чытачы нашай газеты ведаюць не толькі як выкладчыка нямецкай мовы і перакладчыка, але і як паэта. Уладзімір Антонавіч хоць ужо і не працуе ва ўніверсітэце, аднак нярэдка сюды завітвае.***

***Не так даўно ў віцебскага творцы выйшаў новы паэтычны зборнік «На шалях лёсу», з вершамі якога мы сёння знаёмім нашых чытачоў.***




***

На шалях лёсу – шлях і страх...
Не ведаю, што пераможа...
Я пакідаю родны дах
І крочу ў змрок, у бездарожжа.

Бягу праз поле напраксткі,
Без накірунку і без мэты.
Гудуць шаша і бальшакі –
Бяссонніца ў маёй планеты.

Мяне ахутвае абсяг,
Напeрадзе мігценне: што там?
На шалях лёсу толькі страх.
Згубіўся шлях за паваротам.

***

Жанчына тонка адчувае хараство,
У космасе, у людзях, у прыродзе.
Ці праца, ці гульба, вяселле ці жніво –
Ва ўсім жанчына прыгажосць знаходзіць.

І будучыню свету носячы ў сабе,
Сама ва ўсякім стане – прыгажуня.
Не паддаецца злоснай варажбе,
Ліслівасць гідка ад сябе адсуне.

Яе красу не спляміць брудам аніяк.
Кахае шчыра, здрадніку даруе.
Мы на яе святло ідзём, як на маяк.
Любуемся красою, а яна... кіруе.

***

Я не забыўся, дзе мой родны дом,
Я кожны дзень яго прыпамінаю:
Ці з-за стала ўстаю, ці ў ложку засынаю,
І ў дождж, і ў снег... І раніцай, і днём.

Маё дзяцінства мне ўваччу стаіць –
Паленне ў печы, баразна на полі.
Як мне забыць? Я – частка горкай долі.
Што я адтуль, мне проста не ўтаіць.

Ніколі не вярнуся ўжо туды,
У гэны час, гаротны і пяшчотны.
Прыжыўся ў іншым месцы
я, залётны,
а ўсё вяртаюся ў дзіцячыя гады.

Святло міргае мне з далечыні,
Увесь мой шлях асветлены газнічкай,
Лічы ж мяне часцінкай невялічкай
Тваёю, родны край! Прэч не гані!

***

Ты кахала мяне, ты туліла мяне,
Ты шаптала пяшчотныя словы.
А ці думаў тады я, што час праміне,
Прамільгне, нібы зайчык вясновы?

Быў шчаслівы я, танчыў і песні спяваў,
Верыў лёгка спакуслівым марам.
З цэлым светам, здавалася, я сябраваў
І ўсміхаўся і зорам, і хмарам.

Час праходзіў імкліва і ў Лету сцякаў,
І вярнуць яго ўжо немагчыма.
Дзе цяпер той агонь, што мяне апякаў
Пры сустрэчы з тваімі вачыма?

## НАША МОВА

Свідруе душу пытанне...
Але ў каго запытацца?
Няўжо мой народ перастане
Да роднага слова звяртацца?

Няўжо ён парве бяздушна
Повязь з усім мінулым?..
А лічыцца ж ён – і слушна –
Добрым, разумным і чулым.

Няўжо ж ён, дзівак, паддасца
Нядобрым, чужым нагаворам,
Няўжо сваё роднае здасца
На людзях ужыць за сорам?

Ах, сцеражы нас, Божа,
Ад гэткага ачмурэння.
Не, гэткага быць не можа...
Ці й праўда, згніло карэнне?

***

Жыццё – будзённае меню:
Хлеб чорны з соллю.
Каб і хацеў, дык не змяню,
Ня здолею.

Сшарэлі мары ўжо даўно
І летуценні.
Не вабіць хмельнае віно,
Сышлі хаценні.

Я выйшаў за парог. Стаю.
Чаго чакаю?
У жмені лустачку сваю
Сціскаю.